ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)Б, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 15 (7092) | Чацвер, 17 лютага 1944 г. | Цана 20 кап.

*Мы армию нашу растили
в сраженьях,
Захватчиков подлых с дороги
сметем!
Мы в битвах решаем судьбу
поколений,
Мы к славе Отчизну свою
поведем!*

## Аб задачах Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіі

На захваченых совецкіх тэрыторыях гітлераўцы твораць нечуваныя злачынствы. Яны наўмысна, па плану, разбураюць гарады і сёлы, знішчаюць і раскрадаюць матэрыяльныя і культурныя каштоўнасці совецкага народа.

Нямецкія салдаты і афіцэры знішчаюць совецкіх ваеннапалонных і мірнае насельніцтва. Катаванні, здзекі, угон соцень тысяч совецкіх людзей у фашысцкае рабства — масавая штодзённая з'ява.

Перад жахамі фашысцкага тэрора, катаржнай працы, масавых расстрэлаў і атручванняў совецкіх людзей у „душагубках" бледнеюць самыя страшныя злачынствы, якія ведала калі-небудзь гісторыя чалавецтва.

„Злачынствы немцаў,— указвае таварыш Сталін,— гавораць аб слабасці фашысцкіх захватчыкаў, бо так паступаюць толькі ўрэменшчыкі, якія самі не вераць у сваю перамогу. І чым больш безнадзейным становіцца становішча гітлераўцаў, тым больш яны шаленствуюць у сваіх зверствах і грабяжах. Наш народ не даруе гэтых злачынстваў нямецкім катам. Мы прымусім нямецкіх злачынцаў трымаць адказ за ўсе іх злачынствы!"

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 2 лістапада 1942 года была створана Надзвычайная Дзяржаўная Камісія па ўстанаўленню і расследванню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захватчыкаў і іх супольнікаў і прычыненых імі страт грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам СССР.

Задачы Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіі вялікі і адказны.

Яна павінна з максімальнай паўнатой улічыць: факты забойстваў і знішчэння фашысцкімі нягоднікамі мірных грамадзян СССР і совецкіх ваеннапалонных. Яна запісвае ўсе выпадкі зверстваў, насілляў і здзекаў акупантаў над безабароннымі людзьмі, жанчынамі, дзецьмі, старыкамі, факты злачыннага ўгону совецкіх людзей у нямецкае рабства.

Другая задача Надзвычайнай Камісіі—улік страт, прычыненых гітлераўскімі пагромшчыкамі і грабежнікамі совецкаму насельніцтву, калгасам, кааператыўным, профсаюзным і грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам. Фашысты разбураюць жыллёвыя дамы, будынкі і іншыя пабудовы. Яны грабяць і знішчаюць хатнюю і іншую маёмасць, прамысловыя пабудовы, машыны і абсталяванне, сельскагаспадарчыя і прадавольсцвеныя запасы, ураджай, жывёлу і птушку, сродкі транспарта і сувязі. Камісія таксама ўлічвае факты разбурэння або разграблення культурна-асветных устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, школ, бібліятэк, бальніц, музеяў, тэатраў, мастацкіх, культурных і гістарычных каштоўнасцей народаў СССР, а таксама будынкаў, абсталявання і ўтвары рэлігійных культаў.

У саюзных і аўтаномных рэспубліках, у краях і абласцях СССР створаны спецыяльныя камісіі, яднаючыя ўсю работу па расследванню і ўстанаўленню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захватчыкаў. На прадпрыемствах, ва ўстановах і калгасах створаны мясцовыя камісіі, якія ўстанаўляюць страты, панесеныя данай арганізацыяй ад фашысцкай акупацыі.

Задача ўсіх устаноў, арганізацый і асобных грамадзян, іх прамы абавязак— улічыць усе злачынныя дзеянні ворага, сабраць усе даныя з тым, каб рахунак быў поўным. Нашы грамадскія арганізацыі, наш актыў павінен дапамагчы аформіць заявы ўсім тым, хто не можа выканаць гэту работу самастойна.

Страты, прычыненыя нямецка-фашысцкімі акупантамі, вылічваюцца як у грашовых, так і ў натуральных выражэннях у адпаведнасці з інструкцыямі, якія маюцца на мясцах.

Аб злачынствах нямецка-фашысцкіх бандытаў складаюцца акты прадстаўнікамі партыйных, совецкіх арганізацый і грамадскасці пры ўдзеле відавочцаў і сведак. У актах па магчымасці дакладна адзначаюцца нумары і назвы часцей і падраздзяленняў нямецкай арміі, удзельнічаўшых у зробленых злачынствах, прозвішчы віноўнікаў і непасрэдных выканаўцаў. З найвялікшай стараннасцю складаюцца спісы грамадзян, угнаных на фашысцкую катаргу ў Германію.

Усе гэтыя дакументы маюць міжнародны і гістарычны характар,—таму да іх прад'яўляюцца патрабаванні паўнаты, дакладнасці, правільнага афармлення ўсімі неабходнымі датамі, подпісамі, фотаздымкамі.

Ад ступені актыўнасці самога насельніцтва і ўсіх арганізацый на мясцах у многім залежыць поўнае, правільнае і своечасовае выкананне Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіяй важных і адказных задач, ускладзеных на яе Ўрадам СССР.

З рэспублік, краёў, абласцей, з гарадоў, раёнаў і сёл сцякаюцца ў Маскву ў Надзвычайную Дзяржаўную Камісію сотні тысяч актаў, заяў, паказанняў пацярпеўшых і сведкаў. На аснове гэтых дакументаў складаецца суровы рахунак совецкага народа гітлераўскім разбойнікам, забойцам і пагромшчыкам. Нікуды не скрыюцца яны ад караючай рукі народа, бо, як гаворыцца ў апублікаванай за подпісамі Рузвельта, Сталіна і Чэрчыля дэкларацыі аб адказнасці гітлераўцаў за зробленыя зверствы, „тры саюзныя дзяржавы наверняка знойдуць іх нават на краю свету і перададуць іх у рукі іх абвінаваўцаў з тым, каб магло звяршыцца правасуддзе".

На аснове расследванняў на мясцах, актаў мясцовых камісій, судова-медыцынскай экспертызы, паказанняў і заяў шматлікіх сведкаў і відавочцаў, фотаздымкаў і другіх дакументальных матэрыялаў Надзвычайная Дзяржаўная Камісія ўжо апублікавала паведамленні аб зробленых гітлераўцамі злачынствах па Стаўрапальскаму краю, Орлоўскай, Калінінскай, Сталінскай, Смаленскай абласцях. Па матэрыялах Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіі, перааданых Пракурору СССР, прайшлі працэсы над гітлераўскімі зладзеямі і іх пасобнікамі ў Краснадары і Краснадарскім краі, у Харкаве і Харкаўскай абласці.

Гэта толькі пачатак суровай адплаты гітлераўскім катам і бандытам. Недалёк той час, калі пасля поўнага разгрому фашысцкай арміі ўсе яны панясуць заслужаную кару за свае злачынствы.

## Ад Совецкага Інформбюро

### З аператыўных зводак за 15 і 16 лютага

На працягу 15 лютага на поўдзень і на паўднёвы-ўсход ад горада Гдоў нашы войскі з баямі прасоўваліся ўперад і занялі некалькі насялёных пунктаў.

На поўдзень ад горада Луга нашы войскі, прадаўжаючы наступленне, занялі больш 40 насялёных пунктаў, у тым ліку Клабуціцы, Навaселле, Шыльцэва, Рэцюнь, Гарадзец, Малы і Бальшы Брод, Горка-Петроўская і чыгуначная станцыя Серэбранка.

На поўнач ад Звенігародка і Шпола нашы войскі прадаўжалі весці баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка і, сціскаючы кальцо акружэння, авалодалі некалькімі вельмі ўмацаванымі апорнымі пунктамі праціўніка. Адначасова на паўночны-захад ад Звенігародка нашы войскі паспяхова адбілі атакі танкаў і пяхоты праціўніка, якія імкнуліся прарвацца на дапамогу акружанай групіроўцы.

На другіх участках фронта—разведка, артылерыйска-мінамётная перастрэлка і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

На працягу 14 лютага нашы войскі на ўсіх фронтах падбілі і знішчылі 71 нямецкі танк. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіты 32 самалёты праціўніка.

* * *

На працягу 16 лютага на поўдзень і на паўднёвы-ўсход ад горада Гдоў нашы войскі, перамагаючы супраціўленне і контратакі праціўніка, прадаўжалі весці наступальныя баі, у ходзе якіх занялі некалькі насялёных пунктаў і сярод іх Чудскія Заходы, Любацеж, Дудзіна, Мошніно, Баранава і чыгуначную станцыю Ямм.

На паўднёвы-захад і на поўдзень ад Луга нашы войскі з баямі прасоўваліся ўперад і занялі больш 30 насялёных пунктаў, у тым ліку Овінец, Лышніцы, Малое Захонне, Боркі, Озерцы, Крэні, Замошша і чыгуначная станцыя Лямцэва.

На поўнач ад Звенігародка нашы войскі вялі паспяховыя баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка і, сціскаючы кальцо акружэння, авалодалі вельмі ўмацаванымі апорнымі пунктамі яго абароны Яблонаўка, Дацкі, Пруцільцы, Тарашча. Праціўнік прадпрымаў неаднаразовыя спробы прарваць кальцо акружэння, але быў адбіт, панёсшы пры гэтым велізарныя страты ў жывой сіле. Адначасова нашы войскі паспяхова адбівалі контратакі пяхоты і танкаў праціўніка, якія імкнуліся прабіцца на дапамогу акружанай групіроўцы ў раёне на паўднёвы-захад ад Звенігародка.

## *Старэйшы партызан Беларусі В. І. Талаш*

94 годы споўнілася старому беларускаму селяніну Васілію Ісакавічу Талашу. У годы грамадзянскай вайны ён арганізаваў у тылу белагвардзейцаў партызанскі атрад і мужна змагаўся за совецкую ўладу.



Урад узнагародзіў яго тады ордэнам Чырвонага Сцягу.

Калі летам 1941 года гітлераўскія банды занялі вёску В. І. Талаша, старык пайшоў да партызан і актыўна ім дапамагаў у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захватчыкамі.

Нядаўна В. І. Талашу ў Крэмлі ўручылі ордэн Айчыннай вайны 1-й ступені. Ён узнагароджан таксама медаллю „Партызану Айчыннай Вайны".

На здымку: В. І Талаш.

